Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЛІПЕНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №143 (28507)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Лічбы ў жыроўках зменшацца?**

СТАР. 4




**Незвычайныя «лайкі» і дача для суседкі**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## *ЦЫТАТА ДНЯ*



**Ала СТАШКЕВІЧ, начальнік аддзела навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Інстытута культуры Беларусі:**

*«Цяпер трэба ў кожным рэгіёне складаць план захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны. ЮНЕСКА распрацавана структура такога плана. Наша галоўная задача сёння — выявіць праблемы захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў Беларусі. Нематэрыяльная спадчына значна адрозніваецца ад матэрыяльнай, паколькі тут трэба забяспечыць устойлівую эканамічную стабільнасць развіцця рэгіёна, прыцягваць інвестыцыі — разгортваць цэлую сістэму па забеспячэнні жыццядзейнасці гэтага элемента».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9430 | ▼ |
| Еўра | 2,2771 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0749 | ▼ |

# Усім лыжкам лыжка

На Крывінскім тарфяніку ў Бешанковіцкім раёне, дзе знаходзіцца адзін з самых унікальных на тэрыторыі Усходняй Еўропы комплексаў неаліту — бронзавага веку, археолагі знайшлі лыжку, якой чатыры тысячы гадоў.



Фота БЕЛТА.

Кіраўнік археалагічнай экспедыцыі кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Максім ЧАРНЯЎСКІ дэманструе знаходку.

■ Штодзённая эканоміка

## Трацім больш, чым зарабляем?

### Але аддаём перавагу больш танным таварам

**Рознічны тавараабарот за студзень — чэрвень 2017-га склаў 100,3% у супастаўных цэнах да аналагічнага перыяду мінулага года. Тым часам рэальныя грашовыя даходы насельніцтва ў студзені — маі 2017-га склалі 98,8% да ўзроўню студзеня — мая 2016-га. Гэта азначае, што беларусы гатовы траціць свае зберажэнні, каб падтрымліваць пэўны ўзровень жыцця. Вынікі паўгоддзя на прэс-канферэнцыі падвяла намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Беларусі Ірына НАРКЕВІЧ.**

### ДЗЕ НАБЫЦЬ...

Такую тэндэнцыю пацвярджае і сітуацыя на валютным рынку: за першае паўгоддзе фізічнымі асобамі прададзена замежнай наяўнай валюты на $1,34 млрд больш, чым куплена. Да таго ж актывізавалася спажывецкае крэдытаванне: аб'ём крэдытаў вырас на 17%. Ды і кожны з нас можа ўбачыць колькасць растэрмінован, якія прапаноўваюць крамы. Усё гэта паўплывала на рост тавараабароту ў нехарчовай галіне.

Нягледзячы на тое, што на харчаванне выдаткі насельніцтва практычна не зменшыліся, працягваецца тэндэнцыя мінулага года: беларусы аддаюць перавагу больш танным аналагам унутры гандлёвых груп.

СТАР. 3

■ Праверана на сабе

## КУПІЦЬ УСЁ ДА ШКОЛЫ

### Чаму бацькоўскіх сходаў баяцца... бацькі?

**Карэспандэнт «Звязды» атрымаў заданне вызначыць, у якую прыкладна суму абыдзецца падрыхтоўка дзяцей да заняткаў у школе. І даведаўся пра спосабы сэканоміць.**

СТАР. 4




Фота БЕЛТА.

**Да 100-годдзя «Звязды» засталося 12 дзён**

## На ўсе 100!!!

**«Звязда» запрашае вас, шаноўныя чытачы, вашых блізкіх і сяброў на спартыўнае свята, якое адбудзецца ў суботу, 29 ліпеня, на спартыўнай пляцоўцы сталічнага ліцэя №1 (праспект Газеты «Звязда», 6А).**

**Пачатак у 11.00. УВАХОД ВОЛЬНЫ.**

**Падрабязнасці на нашым сайце www.zviazda.by**

ISSN 1990 - 763X